УДК 811.161.3’373.4
© Я.Я. Іваноў

# *“БЕЛАРУСУ І Ў ПАРЫЖЫ СНЯЦЦА БЕЛІЗНА БЯРОЗ І СОСЕН МЕДЗЬ...”* (да складання “Анталогіі беларускага літаратурнага афарызма”: Пімен Панчанка)

Публикуются отрывки из художественных произведений Народного поэта Беларуси Пимена Панченко, которые являются литературными афоризмами. В них отражены философские проблемы природы и общества, морали, любви к Родине, а также рассуждения поэта на другие темы.

The publication contains some fragments from works by Pimen Panchanka which are represented as literary aphorisms. They reflect philosophical problems of nature, society and morals, love to Native Land and other meditations of the writer.

Збіранне і вывучэнне афарыстычнага багацця мовы беларускай мастацкай літаратуры з’яўляецца адной з актуальных праблем сучаснай беларусістыкі. Як заўважае А.Я. Міхневіч, “збіранне, вывучэнне і выданне афарызмаў беларускіх аўтараў – адна з наспелых, нават неадкладных задач нашай філалогіі” [Міхневіч 1994, с. 61]. Увасабленнем гэтай задачы з’яўляецца ўкладанне анталогіі беларускай літаратурнай афарыстыкі, куды павінны ўвайсці як афарыстычныя выказванні, што з’яўляюцца асобнымі літаратурнымі творамі, так і афарызмы, што ўжываюцца ў літаратурных тэкстах неафарыстычнага характару [Іваноў 2001].

Пачынаць стварэнне анталогіі беларускага літаратурнага афарызма трэба, відаць, з вычарпальнага апісання індывідуальна-аўтарскай афарыстыкі асобных пісьменнікаў. Ужо пабачылі свет падборкі афарызмаў Максіма Багдановіча [Іваноў 2000], Янкі Купалы [Ліякумовіч 1995], Якуба Коласа [Іваноў 2002; Міхневіч 2002], Максіма Гарэцкага [Іваноў 2002], Кузьмы Чорнага [Іваноў 2003] Максіма Танка [Гаўрош 2009], Уладзіміра Караткевіча [Новік 2007], Васіля Быкава [Солахаў 1999], Рыгора Барадуліна [Новік 2007], Міхася Стральцова [Работа 1998], Ніны Мацяш [Новік 2006] і інш.

Акрамя гэтага афарызмы беларускіх пісьменнікаў сабраны пад вокладкамі некалькіх зборнікаў, розных па колькасці прадстаўленых аўтараў і прынцыпах адбору афарыстычнага матэрыялу [Янкоўскі 1960; Леванюк 2001; Леванюк 2010; Гаўрош 2012].

Ніжэй прадстаўлены выбраныя афарызмы (усяго каля 40 выслоўяў) з паэтычных твораў Пімена Панчанкі (1917–1995). У іх адлюстраваны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

філасофскія роздумы Народнага паэта Беларусі пра адвечныя пытанні быцця чалавека і прыроды, грамадства, маралі, а таксама яго разважанні на іншыя тэмы.

*Адвыклі мы ад простых добрых слоў*
*І пераждоўваем старыя ісціны...* ("***Апалашчуся хвалямі...").

*Бяда і радасць ходзяць побач вечна,*
*Людзей ратуе толькі чалавечнасць.* ("***На Брэстчыне...").

*Для стварэння лепшых пакаленняў*
*Трэба помніць гора ўсіх дарог.* ("***Не люблю я...").

*Жыццё ў бядзе і ў радасці – адзінае.* ("***Апошні дзень...").

*Не стаў сабе дачасна помнік*
*І ў бяссмерце не спяшы,*
*Лаві не ўласнай славы промні,*
*А сонца кожнае душы.* ("Ямбы").

*Мудрыя вядуць размову мудра,*
*Дурні – як і ў кожныя вякі.* ("Вечныя словы").

*Найлепшае не збываецца,*
*А найгоршае не забываецца.* ("***Нешта пройдзена...").

*Не любіць жыццё аднастайнасці,*
*А прагне штодня навізны.* ("***Хадзіў я па лесе...").

*Не патрэбна забітым*
*Ні славы, ні вечнасці.* ("Як зязюлі кукуюць").

*Не страшны боль, не страшна смерць,*
*Страшней застацца без кахання,*
*У адзіноце анямець,*
*Любімай не пачуць дыхання.* ("Тапаліны звон").

*Першае слова, якому трэба вучыць*
*Дзяцей і прэзідэнтаў – Мір!* ("Галоўнае слова").



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*Хвала і слава могуць разлучыць,*
*А гора і бяда заўсёды зблізяць.* ("Сяброўства").

*Эпоха наша галасістая,*
*Бо кожны хоча прагучаць.* ("Начныя галасы").

*Якой бы краіна малой ні была б –*
*Прасторы яе бясконцыя.* ("Мой Каўказ").

*Ах, як няпроста, як няпроста*
*Адскрэбсці плямы і грахі.* ("***Грызе ўсіх нас нецярплівасць…").

*Зямля мая, сама ты вінавата,*
*Што лёгка многім свой даеш ты хлеб.* ("Тысяча небасхілаў").

*Ёсць закон галоўны свету:*
*Лепш рабі, мацней любі.* ("Дарога").

*У кожнага мара свая залатая,*
*Якую мы песцім, гадуем і любім.* ("Калумбы").

*Без чалавечнасці*
*Не будзе і вечнасці.* ("За вогненнымі вякамі").

*Былі б толькі мір ды вось гэтая сінь,*
*А шчасце народам – дабавіцца!* ("Руіны Карфагена").

*Суіснуе любоў з нянавісцю,*
*Мяжуе гора з добрай радасцю…* ("Пра суіснаванне").

*Мы ўсе бываем часамі грэшнымі,*
*Мы ўсе бываем часамі смешнымі.* ("Пра неўмяшанне").

*Зямля наша – самы святы запаведнік, –*
*І трэба, як маці, яе берагчы.* ("***Кажуць…").

*Толькі б захаваць усё найлепшае,*
*Толькі б пахаваць усё найгоршае.* ("За вогненнымі вякамі").

*А матчынай зямлі карэнні*
*Ніколі не адпусцяць нас.* ("Зямля бацькоў").



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*Бо гэткая наша зямля –*
*Быць мёртвай не хоча.* ("На руінах").

*Мацней бы хацелася верыць*
*Людзям і вершам.* ("***І неба не праяснілася...").

*Такі наш век: не падай у знямозе!*
*Жыві між бур, маланак і трывог.* ("Тысяча небасхілаў").

*Маладосць: не хочаш –*
*не вяртайся.* ("***І мяне хвароба тузанула...").

*Як цяжка лячыцца –*
*Цяжэй, чым вучыцца.* ("Салодкая лячэбніца").

*Цурайся слоў пустых і сцёртых,*
*Як трубкі школьных турнікоў.* ("Ямбы").

*Страшна пакінуць дзяцей між бяды,*
*А потым ісці і не ведаць куды.* ("Самае страшнае").

*Век не мае часу раіцца,*
*Дзе сёння цуд, а дзе не цуд.* ("Дзеці над возерам").

*Для дзяцей пахнуць травы аднолькава*
*На Лонг-Айландзе і пад Масквой.* ("Хлопчык з фермы").

*Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,*
*Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны –*
*Дым над хатай, снапамі прыціснуты ток,*
*Матчын спеў і гароды, прапахлыя кмінам...* ("***Кожны з нас прыпасае Радзімы куток...").

*Няма на свеце земляў непрыгожых.*
*Свой кожны хваліць край,*
*Як мы наш родны кут.* ("***Няма на свеце земляў непрыгожых...").

*Я стаміўся ездзіць і здзіўляцца*
*(Хоць і прызнацца,*
*Ёсць на што глядзець),*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*Беларусу і ў Парыжы сняцца*
*Белізна бяроз і сосен медзь.* ("***Недзе салавей пяе…").

Укладанне анталогіі беларускага літаратурнага афарызма патрабуе вырашэння такіх пытанняў, як вызначэнне яе аб'ёму, крыніц, пабудовы і спосабаў тэксталагічнай апрацоўкі афарыстычных выслоўяў.

Найперш трэба вызначыць паняцце літаратурнага афарызма, пад якім трэба разумець непрэцэдэнтнае выказванне абагульненага (універсальнага) зместу, якое можа быць або асобным літаратурным творам, або часткай літаратурнага тэксту (мастацкага, філасофскага, публіцыстычнага і г. д.).

У анталогіі беларускага літаратурнага афарызма, на нашу думку, вартыя адлюстравання афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў не толькі ўласна аўтарскага паходжання, але і рэмінісцэнцыі, і вольныя (не прамыя) наследаванні, і не сінанімічныя зыходным тэкстам перафразаванні афарызмаў (ці неафарыстычных выказванняў) нейкіх іншых беларускіх і замежных аўтараў або парэмій (як афарыстычных, так і неафарыстычных), аднак не ўсе, а толькі тыя, змест якіх вызначаецца агульначалавечай каштоўнасцю з пункту погляду адлюстравання заканамернасцей існавання чалавека і прыроды.

Крыніцамі анталогіі беларускага літаратурнага афарызма павінны быць надрукаваныя на беларускай мове (у тым ліку і на лацінскай графіцы) мастацкія, публіцыстычныя, крытычныя і іншыя творы, мемуары і эпісталярная спадчына найперш тых беларускіх пісьменнікаў XIX–XX стагоддзяў, якія адыгралі адметную ролю ў станаўленні і развіцці нацыянальнай літаратуры Беларусі, а таксама найбольш выдатных беларускіх літаратуразнаўцаў. Акрамя гэтага крыніцамі анталогіі беларускага літаратурнага афарызма могуць быць усе надрукаваныя на беларускай мове тэксты знакамітых прадстаўнікоў беларускай навукі і культуры, дзяржаўных дзеячаў Беларусі XIX–XX стагоддзяў. У склад крыніц анталогіі беларускага літаратурнага афарызма, на наш погляд, павінны ўвайсці таксама тэксты старажытнага перыяду гісторыі і культуры Беларусі (канца XIV – XVII стагоддзяў) на старабеларускай, лацінскай і польскай мовах, а таксама тая частка польскамоўных тэкстаў беларускіх аўтараў XVIII – XIX стагоддзяў, якой уласціва нацыянальна-культурная адметнасць іх зместу.

Парадак размяшчэння афарызмаў у анталогіі мэтазгодна прыняць храналагічны, калі па гадах жыцця аўтараў вызначаюцца адпаведныя раздзелы анталогіі, унутры якіх афарыстычныя тэксты падаюцца паводле храналогіі з'яўлення іх літаратурных крыніц або, у выпадку адсутнасці дакладных звестак пра час з'яўлення тых ці іншых твораў, паводле парадку размяшчэння апошніх у іх найбольш аўтарытэтным з тэксталагічнага пункту



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

погляду выданні. Афарызмы, якія з'яўляюцца асобнымі літаратурнымі творамі мэтазгодна падаваць у спецыяльных падраздзелах толькі тады, калі яны аб'яднаныя аўтарам у асобныя кнігі або цыклы (у тым ліку і разам з іншымі літаратурнымі творамі-мініяцюрамі). Пры гэтым унутры падраздзелаў павінен захоўвацца той парадак размяшчэння афарызмаў, які прыняты ў адпаведнай кнізе або цыкле. Самі падраздзелы падаюцца паводле часу з'яўлення тых кніг або цыклаў, адкуль бяруцца афарызмы. Ва ўсіх астатніх выпадках афарызмы, якія з'яўляюцца асобнымі літаратурнымі творамі, размяшчаюцца нараўне з кампіляцыямі паводле храналогіі іх стварэння, але абавязкова вылучаюцца спецыяльнымі графічнымі сродкамі (напрыклад, тлустым кеглем або курсівам). Афарызмы, якія бяруцца з іншых рэдакцый і варыянтаў літаратурных крыніц, падаюцца ў складзе агульнага корпуса адзінак паводле агульнай храналогіі. Афарызмы з чарнавых накідаў, незавершаных і стылістычна неапрацаваных вершаў павінны змяшчацца асобна ў канцы раздзелаў. Кожны афарызм павінен дакладна пашпартызавацца ў анталогіі паводле назвы таго літаратурнага твора, адкуль ён бярэцца.

## Літаратура

*Гаўрош, Н.В.* Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н.В. Гаўрош, Н.М. Нямковіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 2012. – 638 с.

*Гаўрош, Н.* "*Хто склаў песню народу, яе рэхам уваскросне*...": афарыстычныя выслоўі ў творах Максіма Танка / Н. Гаўрош, Н. Нямковіч. – Роднае слова. – 2009. – № 9. – С. 52–54.

*Іваноў, Я.Я.* Афарызмы Максіма Багдановіча / Я.Я. Іваноў // Праблемы беларускага літаратуразнаўства / рэд. С.І. Даніленка, Я.Я. Іваноў. – Мінск: МНТ, 2000. – С. 123–131. – ("Terra Alba". Т. 1).

*Іваноў, Я.Я.* Да укладання анталогіі беларускага літаратурнага афарызма / Я.Я. Іваноў // Край = Kraj. – 2001. – № 1–2. – С. 223–239.

*Іваноў, Я.Я.* Кузьма Чорны: "*Трэба глыбей убіраць у сябе жыццё*..." (матэрыялы да "Анталогіі беларускага літаратурнага афарызма") / Я.Я. Іваноў // Край = Kraj. – 2003. – № 3–4 (11–12). – С. 220–222.

*Іваноў, Я.Я.* Максім Гарэцкі: "*Думы мае, думкі, летуценні мае*..." (матэрыялы да "Анталогіі беларускага літаратурнага афарызма") / Я.Я. Іваноў // Край = Kraj. – 2002. – № 1–2 (4–5). – С. 228–238.

*Іваноў, Я.Я.* Якуб Колас: "*Таемны вы, зямлі скрыжалі! Чаго ў сябе вы не ўпісалі!*" (матэрыялы да "Анталогіі беларускага літаратурнага афарызма" з паэмы "Новая зямля") / Я.Я. Іваноў // Край = Kraj. – 2002. – № 3–4 (6–7). – С. 171–183.

*Леванюк, А.Я.* Час, жыццё, людзі...: беларускі літаратурны афарызм / А.Я. Леванюк. – Брэст: Выд. С.Б. Лаўроў, 2001. – 112 с.

*Леванюк, А.Я.* Майстры кажуць...: беларускія літаратурныя афарыстычныя выслоўі: слоўнік афарызмаў / А.Я. Леванюк. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2010. – 161 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Ліякумовіч, Ц.* Янка Купала: запаветныя словы / Ц. Ліякумовіч // Роднае слова. – 1995. – № 2. – С. 42, 50; № 4. – С. 14 [Пра бацькоўскі край], 38, 58, 76, 112, 140 [Пра гуманізм, інтэрнацыяналізм і патрыятызм]; № 5. – С. 10, 38 [Пра адвечныя законы жыцця], 130, 144, 163, 177; № 7. – С. 57, 138, 181; № 8. – С. 24, 64, 71 [Пра долю людскую], 168; № 9. – С. 37, 65, 83, 99, 134 [Пра неабходнасць змагання за свабоду і незалежнасць]; № 10. – С. 19, 92 [Пра грамадскую смеласць і рашучасць], 180; № 11. – С. 53, 66 [Пра адносіны да працы], 84 [Пра адказнасць перад часам], 91, 100, 157 [Пра праўду]; № 12. – С. 71, 170 [Пра шчасце, пра каханне], 171–172 [Пра чалавечыя заганы], 190 [Пра пісьменніцкую працу].

*Міхневіч, А.Я.* Афарызмы / А.Я. Міхневіч // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мінск: БелСэ, 1994. – С. 60–61.

*Міхневіч, А.Я.* Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца… (выбраныя выслоўі народнага песняра) / А.Я. Міхневіч. – Мінск: БелДІПК, 2002. – 108 с.

*Новік, М.* "*Даверамся найлепшаму ў сабе*": афарыстычнае слова Ніны Мацяш / М. Новік // Роднае слова. – 2006. – № 9. – С. 38–40.

*Новік, М.* "*Не знікаць паэтам вечна, у вечнай песні жывучы*": афарыстычныя выслоўі Уладзіміра Караткевіча / М. Новік // Роднае слова. – 2007. – № 1. – С. 24–26.

*Новік, М.* "*Пачуць, як душу адмыкае Бог…*": афарыстычныя выслоўі Рыгора Барадуліна / М. Новік // Роднае слова. – 2007. – № 10. – С. 22–24.

*Работа, Н.* Міхась Стральцоў. "*Але ж тое – гэтае спазнаем…*": выслоўі з паэзіі і прозы / Н. Работа // Роднае слова. – 1998. – № 8. – С. 54–58.

*Солахаў, А.* Залацінкі мудрасці (крылатыя выразы) / В. Быкаў; падабраў А. Солахаў // Роднае слова. – 1999. – № 5–6. – С. 15 [Пра Бацькаўшчыну], 20, 37 [Пра чалавека], 69, 84, 100, 126, 130, 139 [Пра адносіны паміж людзьмі], 165 [Пра жыццё]; № 7. – С. 67, 163 [Пра жыццё]; № 8. – С. 38, 86 [Пра жыццё], 144, 171 [Пра смерць], 192, 199, 205, 212 [Пра вайну]; № 9. – С. 16, 34 [Пра смерць], 21, 79 [Пра вайну], 84, 114, 158 [Пра подзвіг, храбрасць]; № 10. – С. 60, 94 [Пра баязлівасць і здраду], 115, 143 [Пра ўладу і кіраванне]; № 11. – С. 89 [Пра ўладу і кіраванне], 94, 140 [Пра мір і волю], 159; № 12. – С. 38 [Пра шчасце], 38, 47, 73 [Пра каханне і жанчын], 73, 86, 115 [Пра таварыства], 171, 200 [Пра розум], 188 [Пра роздум], 189 [Пра характар, натуру чалавека], 189–190 [Пра сумленне], 190 [Пра дабрыню], 190–191 [Пра надзею], 191 [Пра веру], 191 [Пра бацькоў і дзяцей], 191–192 [Пра літаратурную і пісьменніцкую працу].

*Янкоўскі, Ф.* Крылатыя словы і афарызмы (з беларускіх літаратурных крыніц) / Ф. Янкоўскі. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1960. – 136 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова